УДК 371:378.4

**М. Я. Сяменчык**, доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры (БДТУ)

# ТЭМА БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ Ў АДУКАЦЫЙНА-ВЫХАВАЎЧЫМ ПРАЦЭСЕ Ў ТЭХНІЧНЫХ ВНУ

Артыкул прысвечаны праблеме ідэалагічнага выхавання студэнтаў тэхнічных ВНУ ў працэсе выкладання сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. Даецца крытычная ацэнка існуючых дапаможнікаў па праблемах гуманітарнай адукацыі і ідэалагічнага выхавання. Звяртаецца ўвага на існуючыя недахопы ў трактоўцы дзяржавастваральных працэсаў на Беларусі. На прыкладзе тэмы беларускай дзяржаўнасці разглядаецца выхаваўчы патэнцыял гісторыі Беларусі, паліталогіі і асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы.

The article dwells upon the problem of the ideological upbringing of the students of technical higher education institutions in the process of teaching the social and human studies. The critical estimation is given to the present manuals on the humanitarian education and ideological upbringing problems. The existing disadvantages in the explanation of the state formation processes are taken into account. The upbringing potential of the History of Belarus, Politology and the Ideology of the Belarusian State is considered; the concept of the Belarusian statehood being taken as an example.

**Уводзіны**. Апошнім часам у нашым грамадстве актуалізавалася патрэба ў ідэалагічным выхаванні студэнтаў. У ВНУ знешне гэтая праца ўвасабляецца ў мностве і разнастайнасці ідэйна-выхаваўчых мерапрыемстваў, але, вядома ж, імі не вычэрпваецца. Куды больш значная яе частка адбываецца ў працэсе выкладання грамадскіх дысцыплін. Паводле дзеючага Адукацыйнага стандарту, ва ўсіх ВНУ, нягледзячы на іх профільныя адрозненні, адбываецца сацыяльна-гуманітарная падрыхтоўка студэнтаў з мэтай фарміравання і развіцця іх сацыяльна-асабовых кампетэнцый, у тым ліку скіраваных на развіццё патрыятызму і грамадзянскасці [1]. У многім такія ж якасці, у ліку іншых, заклікана выхоўваць ідэалогія беларускай дзяржавы. Цяжка раскрыць змест усіх вызначальных для фарміравання высокамаральнай асобы ідэй і ахарактарызаваць найбольш спрыяльныя для таго дысцыпліны. Таму ў межах вучэбных праграм па гісторыі Беларусі, паліталогіі і асноў ідэалогіі мы спынімся на асобных аспектах беларускай дзяржаўнасці, на нашу думку, найбольш плённых у адукацыйным і выхаваўчым планах, асабліва ў тэхнічных ВНУ, дзе існуе востры дэфіцыт гуманітарнай думкі.

**Асноўная частка**. Ідэя дзяржаўнасці заўсёды мела ідэалагічны падтэкст. Да прыкладу, у савецкія часы ў тэхнічных, медыцынскіх і інш. ВНУ выкладалася толькі гісторыя панаваўшай партыі – КПСС. Акрамя таго, у ВНУ, якія рыхтавалі выкладчыкаў і даследчыкаў гісторыі, існавала дысцыпліна «Гісторыя БССР». Відавочна, што тагачаснае патрыятычнае і грамадзянскае выхаванне грунтавалася на камуністычных каштоўнасцях, да якіх дасавецкія дзяржаўныя ўтварэнні не адносіліся. Толькі з пачаткам перабудовы гэты хіб быў пераадолены і «Гісторыя Беларусі» стала выкладацца ва ўсіх, нават тэхнічных ВНУ.

У 1990–1991 гг. у вучэбныя планы была ўключана паліталогія, вывучэнне якой дало студэнтам магчымасць зірнуць на дзяржаўны лад СССР не толькі з класавых пазіцый, а праз прызму агульначалавечых каштоўнасцяў. У выніку такія каштоўнасці, як «савецкі патрыятызм» і «пралетарскі інтэрнацыяналізм» былі адкінуты разам з аджытой ідэалогіяй. З абвяшчэннем Рэспублікі Беларусь патрыятычнае і грамадзянскае выхаванне зрабілася больш прадметным і дзейсным У 2003 г. вучэбныя праграмы ВНУ папоўніліся «Асновамі ідэалогіі беларускай дзяржавы». Мы разглядаем яе як сістэму нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцяў, у тым ліку ўсіх людзей, свой народ, Айчыну, дзяржаву, родную мову, гісторыю, культуру, рэлігію. Вядома ж, вывучэнне студэнтамі «Асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы» значна ўзмацняе іх павагу да беларускай дзяржаўнасці, як мінулай, так і сучаснай. Несумненна, што змешчаныя ў азначанай дысцыпліне тэмы «Беларуская супольнасць, нацыянальная ідэя і дзяржаўнасць», «Уяўленне народа аб сваёй дзяржаўнасці», «Абвяшчэнне Рэспублікі Беларусь – пачатак новага этапу ў развіцці беларускага народа і яго дзяржаўнасці», «Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі – форма практычнай рэалізацыі беларускай нацыянальнай ідэі ва ўмовах сусвету, які глабалізуецца», «Традыцыйныя (сацыякультурныя) ідэалы і каштоўнасці беларускага народа», «Свабодалюбства і патрыятызм беларусаў» і інш., пабудаваныя на сінтэзе гістарычных, палітычных і культуралагічных ведаў, маюць не столькі адукацыйны, колькі ідэйна-выхаваўчы патэнцыял.

Заўважым, аднак, што ў свой час складальнікі «Праграмы выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь» нават не палічылі патрыятызм паўнавартай каштоўнасцю і рэкамендавалі выхоўваць яго «разам з інтэрнацыя-

налізмам» [2]. Аб памылковасці гэтага падыходу сведчыць факт, што менавіта такія «інтэрнацыяналісты» як В. Кнорын, К. Ландэр, А. Мяснікоў у 1917–1918 гг. былі катэгарычна супраць афармлення беларускай дзяржаўнасці. Ды і патрыётамі яны сябе не лічылі.

Студэнты павінны ўсвядоміць, што патрыятызм – гэта не толькі любоў да Радзімы і гатоўнасць абараняць яе ў час ваеннага ліхалецця, але і штодзённая праца ў накірунку ўмацавання яе патэнцыялу. І калі патрыятызм асацыіруецца з Радзімай, то грамадзянскасць – з дзяржавай. Сапраўдны грамадзянін – гэта асоба, якой уласцівы, найперш, законапаслухменства і сумленная праца на карысць сваёй краіны. Акрамя таго, і патрыёт, і грамадзянін ніколі не пацерпяць зняважлівых слоў на адрас сваёй дзяржавы ад рознага кшталту касмапалітаў і «інтэрнацыяналістаў». Нігілісцкае стаўленне студэнтаў да нацыянальных каштоўнасцяў часцей фармуецца стыхійна, але часам таму спрыяе кан'юнктурная творчасць квазігісторыкаў і непрафесійная праца выкладчыкаў.

Пад тэрмінам «дзяржаўнасць» варта разумець здольнасць пэўнага этнасу адстойваць свае інтарэсы з дапамогай палітычнай улады. У гэтай сувязі нельга лічыць Полацкае княства, ВКЛ ці Рэч Паспалітую беларускімі дзяржавамі. Магчымасць яе стварэння склалася толькі з узнікненнем беларускай нацыі. Але зараз знаходзяцца аўтары, якія заяўляюць, быццам нельга называць Полацкае або Тураўскае княствы дзяржавамі. Ім не лішнім было б прыгадаць палажэнне Канстытуцыі аб «шматвяковай гісторыі развіцця беларускай дзяржаўнасці» [3] або пачытаць тэкст выступлення А. Р. Лукашэнкі на IV Усебеларускім сходзе [4].

Нават не самаму здольнаму студэнту павінна стаць зразумелым, што ў сістэме іншых каштоўнасцяў азначаныя княствы і ўсё звязанае з імі з'яўляюцца больш прыярытэтнымі, чым Кіеўская Русь. Характэрна, што грамадзяне сучаснай Расіі (этнічныя рускія) абгрунтоўваюць версію паходжання сваёй дзяржаўнасці не ад Кіева, а ад Ноўгарада ці Ладагі.

Палітычная кан'юнктура перашкаджае большасці аўтараў дапаможнікаў па вартасці ацаніць ролю ВКЛ у лёсе беларусаў: дзяржаўны статус іх мовы, узровень развіцця заканадаўства, кнігадрукавання, культуры. Між тым, выкладчык павінен адкінуць байкі аб нібыта навязанай палякамі Люблінскай уніі і гвалтоўным акаталічванні беларусаў, прывесці доказы існавання ідэй гуманізму, паказаць прагрэсіўную сутнасць магдэбургскага права і Літоўскага Статута і г. д., каб пераканаць студэнтаў у тым, што ліцвіны па гэтых паказчыках пакінулі ўсходніх «збіральнікаў Русі» далёка ззаду.

Студэнты павінны ведаць, што ВКЛ працягвала сваё існаванне ў складзе Рэчы Паспалітай амаль да канца 80-х гг. XVIII ст. Няма падстаў лічыць гэты этап дзяржаўнасці выключна негатыўным, а палітыку ў дачыненні беларусаў толькі гвалтоўнай. Так, асноўная маса сялян і гараджан Беларусі спавядала ўніяцтва, а шляхта акаталічвалася і апалячвалася дабрахвотна. Гэта яна, а не ўлада, дамаглася замены ў 1696 г. беларускай дзяржаўнай мовы на польскую.

Адэкватнаму асэнсаванню гісторыі Рэчы Паспалітай спрыяе вывучэнне матэрыялаў аб дасягненнях у гаспадарцы і культуры, войнах з захопнікамі, паўстаннях супраць прыгнятальнікаў і інш. Варта падкрэсліць, што са знішчэннем гэтай дзяржавы дух яе жыхароў, у першую чаргу шляхты і каталіцкіх вернікаў Беларусі, застаўся непарушным, аб чым сведчылі спробы аднаўлення ВКЛ у часы напалеонаўскага нашэсця, дзейнасць тайных таварыстваў, паўстанні 1830–1831 гг. Менавіта ў асяроддзі мясцовай шляхты каталіцкага і ўніяцкага веравызнанняў з'явіліся парасткі беларускай нацыянальнай свядомасці. Гэтыя людзі марылі аб адраджэнні Рэчы Паспалітай і ў яе межах – наданні Літве (Беларусі) пэўнай самастойнасці.

Сяляне па-ранейшаму заставаліся далёкімі ад палітыкі, але хваля русіфікацыі, якая абрынулася на Беларусь у 1864 г. пасля падаўлення польскага паўстання, акрамя іншага, паспрыяла вылучэнню з іх асяроддзя чыноўніцтва і інтэлігенцыі. Іх ідэйная кансалідацыя з беларуска-арыентаванай шляхтай значна стымулявала працэс фарміравання беларускай нацыі, а разам з тым – пошуку шляхоў да нацыянальнай дзяржаўнасці ў межах Расійскай імперыі. Члены суполкі «Гомон», Ф. Багушэвіч і інш. першымі апелявалі да мінулага вопыту беларускай дзяржаўнасці. Жаданне беларусаў «людзьмі звацца», выказанае ў вершы Я. Купалы «А хто там ідзе?», стварала магутны падмурак усенароднага руху за «вольную Беларусь».

Студэнтам важна давесці, што не толькі царызм, не толькі рускі ці польскі шавінізм, а і нізкі ўзровень нацыянальнай самасвядомасці беларусаў перашкаджалі гэтаму руху. Да таго ж, нават пасля звяржэння самаўладдзя ў 1917 г. існаваўшыя імперскія ідэі і ідэалогія заходнерусізму не пакідалі беларусам шанцаў не толькі на афармленне дзяржаўнасці, але і на стварэнне беларускай школы. Актывізаваны Кастрычнікам рух беларускіх арганізацый за нацыянальную аўтаномію ў складзе Расійскай дэмакратычнай рэспублікі скончыўся ў ноч на 18 снежня 1917 г. разгонам бальшавікамі Усебеларускага з'езда. Адзначым, што рэалізацыя яго арганізатарамі пастаўленых мэтаў пазбаўляла народы цяперашніх Рэспублікі Беларусь і Ра-

сійскай Федэрацыі патрэбы стварэння саюзнай дзяржавы.

У чарзе наступных падзей асобае месца займае БНР як узор беларускай дзяржаўнасці на нацыянальна-дэмакратычнай аснове. Тое, што яе арганізатары імкнуліся ажыццявіць нацыянальныя ідэалы ва ўмовах германскай акупацыі, толькі робіць ім гонар. Роўна як і дзеячам Белнацкома і Беларускіх секцый РКП(б), якія пры падтрымцы У. Леніна і І. Сталіна 1 студзеня 1919 г. абвясцілі аб стварэнні дзяржавы на рэвалюцыйна-класавай аснове – БССР.

Аб тым, што беларусы прынялі савецкі лад і спрыялі яму, сведчаць іх удзел у стварэнні СССР, вынікі сацыялістычнага будаўніцтва, беларусізацыя, Канстытуцыі 1927, 1937 і 1978 гадоў. Невыпадкова яны так мужна змагаліся за свабоду і незалежнасць сваёй Радзімы і СССР у Вялікай Айчыннай вайне, так самаахвяравана аднаўлялі сваю краіну ў другой палове 1940-х гг. І наогул, лепшыя ўзоры патрыятызму і грамадзянскасці ў першую чаргу бачны менавіта на прыкладзе Вялікай Айчыннай, і крыху менш – у аднаўленчы перыяд. І гэта вельмі сімвалічна, бо найлепшыя чалавечыя якасці выяўляюцца не толькі на вайне, але і ў мірнай працы.

Асобае месца ў выхаванні патрыятызму і грамадзянскасці займае час, калі наша краіна набыла свой суверэнітэт і потым яго ўмацоўвала. Варта адзначыць, што многія палітычныя дзеячы лічаць развал СССР буйнейшай геапалітычнай катастрофай. Тым не менш, без гэтай катастрофы не адбылося б утварэння незалежнай Беларусі, аб якой спрадвек марылі нашы продкі. Менавіта на яе ўмацаванне скіравана ўся палітычная, сацыяльна-эканамічная, культурная дзейнасць грамадзян Беларусі. Асаблівы клопат у гэтым сэнсе выказваецца да студэнцкай моладзі як будучых яе гаспадароў. Таму заклікана спрыяць пастаянная ўвага ўрада, у тым ліку праз змест адукацыйных праграм. Так, да нашага часу змест «Паліталогіі» істотна змяніўся ў бок большага адлюстравання беларускіх палітычных рэалій. У яе праграму змешчаны пункты «Функцыянаванне палітычнай улады ў Рэспубліцы Беларусь», «Развіццё прававой дзяржавы і грамадзянскай супольнасці», «Выбарчая сістэма Рэспублікі Беларусь» і інш. Пры гэтым тэарэтычны матэрыял, які там размешчаны, арганічна спалучаецца з нашай рэчаіснасцю.

У нашы дні тэма дзяржаўнасці займае адно з асноўных месцаў у ідэалагічным выхаванні моладзі. Не страціць яна сваёй значнасці і падчас ажыццяўлення стратэгічнай мэты – утварэння саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. Спробы маскоўскіх алігархаў навязаць свае ўмовы аб'яднання выклікалі цвёрды адказ Прэзідэнта А. Р. Лукашэнкі: «Суверэнітэтам не гандлюем!». «Суверэнітэт – казаў ён на IV Усебеларускім сходзе, – гэта вышэйшая нацыянальная каштоўнасць, якую трэба штодзённай працай умацоўваць і абараняць» [4]. У гэтых словах, акрамя іншага, змешчана канцэнтраваная ацэнка нашай мінулай і сучаснай дзяржаўнасці, а таксама гарантыя пабудовы моцнай і квітнеючай Беларусі.

**Заключэнне**. Такім чынам, беларуская дзяржаўнасць на ўсіх этапах яе развіцця – ад Полацка і да сучаснай Рэспублікі Беларусь – ўяўляе сабой адну з самых найвялікшых нацыянальных каштоўнасцяў. Тэма беларускай дзяржаўнасці пры ўмелай пастаноўцы адукацыйна-выхаваўчай працы ў тэхнічных ВНУ павінна зрабіцца для студэнтаў невычарпальнай крыніцай ведаў, духоўнага здароўя і высокіх ідэйна-маральных якасцяў.

**Літаратура**

1. Образовательный стандарт Республики Беларусь. Высшее образование. Первая ступень. Цикл социально-гуманитарных дисциплин. – Введ. 01.09.2007. – Минск: М-во образования Респ. Беларусь, 2006. – 28 с.

2. Праграма выхавання дзяцей і моладзі ў Рэспубліцы Беларусь. – Мінск: БДТУ, 2001. – 80 с.

3. Конституция Республики Беларусь 1994 года (с изменениями и дополнениями, принятыми на республиканских референдумах 24 ноября 1996 г. и 17 октября 2004 г.). – Минск: Амалфея, 2008. – 48 с.

4. Наш исторический выбор – независимая, сильная и процветающая Беларусь. Из выступления Президента Респ. Беларусь А. Г. Лукашенко на IV Всебелорусском народном собрании // Беларуская думка. – 2010. – № 12. – С. 3–17.

*Паступіла 15.04.2011*